разрастания в ней соединительной ткани.

Таким образом, в печени развивается комплекс взаимосвязанных и взаимообуславливающихся патологических процессов, приводящих к альтеративному паразитарному гепатиту: травмирование паренхимы, сосудов, дистрофия гепатоцитов.

УДК 619:616.61-084:636.4.053

## ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ СТАН НЫРАК У ПАРАСЯТ ПРЫ ФАРМАКАПРАФІЛАКТЫЦЫ ЎНУТРАНЫХ НЕЗАРАЗНЫХ ХВАРОБ

**Сушко К. І.** – магістрант
**Пазняк П. С., Хахлянок А. Ю.** – студэнты
Навуковы кіраўнік – **Пятроўскі С. У.**
УА «Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Забеспячэнне высокай прадуктыўнасці і рэалізацыя генетычнага патэнцыялу свіней – найважнейшыя задачы сучаснай прамысловай свінагадоўлі. Аднак часцяком у сувязі з парушэннямі тэхналагічных працэсаў і кармлення свінні падвяргаюцца шматлікім стрэсавым і таксічным уздзеянням. У далейшым у жывёл развіваецца імунадэфіцытны стан і актывізуюцца неспецыфічныя мікраарганізмы. У такіх выпадках у органах дыхальнай і стрававальнай сістэм узнікаюць запаленчыя змены, характэрныя для такіх хвароб, як дыспепсія, гастраэнтэрыт, бранхіт, бронхапнеўманія [1].

Барацьба з дадзенымі паталогіямі павінна быць комплекснай, з адначасовым выкарыстаннем эфектыўных сродкаў тэрапіі і прафілактыкі, якія аказваюць комплексны ўплыў на розныя бакі этыялогіі і патагенезу ўнутраных хвароб. У сувязі з гэтым намі было прынята рашэнне аб выбары ў якасці лекавых сродкаў ёдутрымліваючага прэпарата «Ёдавіт» і імунастымулюючага прэпарата «Ветбідол», лячэбна-прафілактычную эфектыўнасць якіх планавалася ацаніць.

Ва ўмовах свінагадоўчага комплексу былі вызначаны змены біяхімічнага складу крыві парасят-смактуноў і парасят участка дарошчвання пад уздзеяннем ветэрынарных прэпаратаў «Ёдавіт» (першая доследная група) і «Ветбідол» (выкарыстаны сумесна з прэпаратам «Ёдавіт» у другой доследнай групе). Звесткі пра змены клінічнага стану і гаспадарчазначных паказчыкаў парасят, а таксама пра метадыку правядзення доследаў прыведзены ў надрукаваных раней працах [2, 3]. На пачатку правядзення выпрабаванняў (да ўвядзення прэпаратаў), пасля заканчэння іх выкарыстання (на трэція дні пасля пераводу на

дарошчванне і на адкорм) у парасятаў кантрольнай і доследных груп былі адабраны ўзоры крыві для біяхімічнага даследавання. У крыві вызначаліся канцэнтрацыі мачавіны і крэатыніну.

Пры фарміраванні груп статыстычна значных адрозненняў паміж утрыманнем у сываратцы крыві мачавіны і крэатыніна ў парасят розных груп вызначана не было. На момант заканчэння выкарыстання прэпаратаў канцэнтрацыя мачавіны ў сываратцы крыві парасят доследных груп знаходзілася на больш высокім узроўні (але статыстычна нязначным), чым у парасят кантрольнай групы. Канцэнтрацыя крэатыніну, наадварот, мела статыстычна значна ($P < 0,05$) нізкія значэнні (у параўнанні з паказчыкамі парасят кантрольнай групы): у першай доследнай групе – на 47,7 %, у другой доследнай – на 56,8 %.

Пры передачы жывёл на адкорм узровень мачавіны быў статыстычна значна больш высокі ($P < 0,05$) у першай і другой доследных групах (на 42,1 і 63,1 % адпаведна). Узровень крэатыніну стаўся статыстычна значна ніжэйшым ($P < 0,05$) у сываратцы крыві парасят першай і другой доследных груп (на 45,4 і 43,5 % адпаведна ў параўнанні з паказчыкамі кантрольнай групы).

Утрыманне мачавіны і крэатыніну ў сываратцы крыві – маркеры функцыянальнай актыўнасці нырак і сінтэтычнай функцыі печані. Гэта значыць, што ў парасят да моманту перадачы на адкорм у печані і нырках развіўся комплекс запаленчых (верагодна, з хранічным цячэннем) і дыстрафічных зменаў. Узнікненне запаленчых, дыстрафічных і некратычных змяненняў у нырках парасят кантрольнай групы – следства эндагеннай інтаксікацыі, што ўзнікае пры страўнікава-кішэчных і рэспіраторных хваробах, метабалічных хваробах, пры зніжэнні прыёму корму, выкарыстанні нефра- і гепататаксічных лекавых сродкаў. Гэтыя негатыўныя змены паспяхова выкараняліся пры правядзенні лячэбна-прафілактычных мерапрыемстваў, што праводзіліся ў парасят доследных груп з выкарыстаннем прэпаратаў «Ёдавіт» і «Ветбідол».

**ЛІТАРАТУРА**

1. Карпуть, И. М. Иммунология и иммунопатология болезней молодняка / И. М. Карпуть. – Минск: Ураджай, 1993. – 288 с.

2. Петровский, С. В. Фармакопрофилактика внутренних болезней у проверяемых свиноматок и поросят / С. В. Петровский, К. И. Сушко, И. О. Петроченко // Ветеринарный журнал Беларуси.– 2024.– № 2 (21).– С. 53-59.

3. Сушко, К. И. Изменения хозяйственных показателей у поросят при профилактике респираторных и желудочно-кишечных болезней в подсосный период / К. И. Сушко, С. С. Дудко, А. В. Трофимович // Перспективы развития научной и инновационной деятельности молодежи в ветеринарии: материалы международной научно-практической конференции студентов, магистрантов, аспирантов и молодых ученых 12 июля 2024 г. – п. Персиановский: Донской ГАУ, 2024. – С. 106-109.